УДК 94(476)"1929–1939":322:281.93 DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-56-60

# НЕТРАДЫЦЫЙНАЯ РЭЛІГІЙНАСЦЬ СЯРОД ПРАВАСЛАЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БССР У 1930-Я ГГ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРХІВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ)

*канд. гіст. навук, дац. Г.С. КАЛІНІНА*
*(Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск)*
*ORCID: https://orcid.org/0009-0000-4741-3177*

*Артыкул прысвечаны спробам выяўлення і аналізу элементаў нетрадыцыйнай рэлігійнасці ў праваслаўным асяроддзі БССР, што фарміраваліся ў 1930-я гг. пад уплывам секулярнай палітыкі савецкай дзяржавы, якая мела сваёй асноўнай мэтай паслядоўнае выцясненне рэлігіі і царквы з усіх сфер жыцця грамадства. Даследаванне праводзіцца паводле класіфікацыі тыпаў нетрадыцыйнай рэлігійнасці па структуры, распрацаванай спецыялістам па новых рэлігійных рухах У.А. Марціновічам, на аснове дакументаў дзяржаўных рэспубліканскіх і рэгіянальных архіваў Беларусі. Указваючы на некаторыя тэрміналагічныя цяжкасці, звязаныя з неакрэсленасцю ўжывання тэрміна "царкоўнік" у дзяржаўна-партыйнай дакументацыі, аўтар прыходзіць да высновы аб распаўсюджванні сярод праваслаўных вернікаў БССР такіх тыпаў нетрадыцыйнай рэлігійнасці, як культавае асяроддзе грамадства і элементы ўнутрыцаркоўнага сектанцтва, а таксама вызначае ўплыў антырэлігійнай дзяржаўнай палітыкі на пераход праваслаўных ва ўласна секты.*

***Ключавыя словы:*** *праваслаўе, Беларуская Праваслаўная Царква, нетрадыцыйная рэлігійнасць, культавае асяроддзе грамадства, унутрыцаркоўнае сектанцтва, секты, антырэлігійная палітыка савецкай дзяржавы.*

**Уводзіны.** Вельмі неспрыяльныя рэлігійна-палітычныя абставіны ў СССР у 1930-я гг., што выяўляліся ў спробах дзяржавы ліквідаваць рэлігію з усіх сфер жыцця грамадства, выклікалі непрыманне і супрацьдзеянне гвалтоўнай секулярызацыі з боку праваслаўных вернікаў. Апошнія, дзеля таго каб захаваць сваю ўласную рэлігійную ідэнтычнасць, часам нават імкнуліся да свядомай ізаляцыі ад савецкай рэальнасці і шчыра бачылі ў камуністычнай уладзе прыход "антыхрыста". У некаторых выпадках адказы вернікаў на выклікі з боку варожай да рэлігіі рэчаіснасці прыводзілі, так ці інакш, да змен у традыцыйнай рэлігійнай свядомасці і папаўнялі "скарбонку" форм нетрадыцыйнай рэлігійнасці.

Мэта дадзенага артыкула – спроба выяўлення і агляду розных тыпаў нетрадыцыйнай рэлігійнасці ў асяроддзі праваслаўнага насельніцтва БССР у 1929–1939 гг. на аснове матэрыялаў дзяржаўных архіваў Беларусі.

Даследаванне праводзіцца ў адпаведнасці з класіфікацыяй тыпаў нетрадыцыйнай рэлігійнасці па структуры (характарыстыка членства і ступень развіцця арганізацыйнай структуры групы), распрацаванай беларускім даследчыкам новых рэлігійных рухаў У.А. Марціновічам [1, с. 90]. Згодна У.А. Марціновічу, "нетрадыцыйная рэлігійнасць ("сектанцкасць") – гэта рэлігійная форма адхілення ад існуючых межаў варыятыўнасці норм і нарматыўных паводзін, якая склалася як пад уплывам усіх асноўных інстытутаў грамадства, так і ў выніку стыхійнай самаарганізацыі і жыццядзейнасці грамадства" [1, с. 181].

Матэрыяламі для працы паслужылі дакументы дзяржаўных рэспубліканскіх і абласных архіваў Рэспублікі Беларусь, у большасці – справаздачна-інфармацыйная дакументацыя: дакладныя запіскі "Пра стан антырэлігійнай прапаганды" па раёнах, акругах і БССР у цэлым, справаздачы раённых і акруговых партыйных камітэтаў аб праведзенай рабоце, якія накіроўваліся ў ЦК КП(б)Б, спецзводкі, інфармацыйныя зводкі і палітданясенні ДПУ (НКУС) "Аб настроях насельніцтва…" і г.д. Гэтыя дакументы сведчаць аб розных праявах рэлігійнага жыцця веруючага насельніцтва, бо ў іх, разам з праваламі і дасягненнямі антырэлігійнай працы, партыйныя работнікі/супрацоўнікі спецорганаў дакладвалі аб рэлігійнай сітуацыі ў раёне/акрузе, аб актыўнасці мясцовых "царкоўнікаў і сектантаў".

Пры гэтым неабходна адзначыць пэўныя цяжкасці з тэрміналогіяй, а менавіта з тэрмінам "царкоўнік", які шырока выкарыстоўвалі аўтары вышэйзгаданых афіцыйных савецка-партыйных дакументаў. Вядома, што дзяржава, прымаючы ўсякую праяву рэлігійнасці за контррэвалюцыйныя дзеянні, зрабіла ў 1930-я гг., асабліва ў другой палове, стаўку на знішчэнне рэлігіі сілавымі метадамі самой па сабе, з прычыны чаго знікла неабходнасць разбірацца ў канфесійных нюансах і асаблівасцях розных царкоўных плыняў, якая існавала ў 1920-я гг. У сувязі з гэтым усе вернікі падпадаюць пад абагульненыя катэгорыі "царкоўнік", "сектант", "клерыкал". Прадстаўнікі розных плыняў у праваслаўі (патрыяршай ці аўтакефальнай царквы, абнаўленцы, часам нават стараверы) траплялі пад паняцце "царкоўнік". Акрамя таго, у паведамленнях спецсупрацоўнікаў думкі аб рэлігійнай сітуацыі, напрыклад, у сувязі з перапісам насельніцтва, выказвалі "аднаасобнікі", "калгаснікі", "кулакі", што робіць у такіх выпадках практычна немагчымым вызначэнне канфесійнай прыналежнасці рэспандэнта.

**Асноўная частка.** Выпадкі, калі аўтары дакументаў удакладняюць прыналежнасць тых ці іншых вернікаў да канкрэтнай рэлігійнай групы (напрыклад, прыводзяць найменні радыкальных праваслаўных груповак – "чырвонадраконаўцы", "маўчальнікі", згадкі аб стараверах), сустракаюцца рэдка. Акрамя таго, шэраг незарэгістраваных груп праваслаўных памылкова адносяць да евангелістаў, штундыстаў ці проста сектантаў. З прычыны падобнай блытаніны паняццяў вызывае цяжкасці аддзяліць у агульнай масе фактаў дзейнасць праваслаўных

вернікаў ад дзейнасці, напрыклад, уласна сектантаў ці стараавераў. Таму развважаць пра распаўсюджванне нетрадыцыйнай рэлігійнасці сярод праваслаўных вернікаў даводзіцца з наступнымі агаворкамі: у адных выпадках можна безумоўна сцвярджаць аб праваслаўнай прыналежнасці тых ці іншых вернікаў, асабліва калі гэта дапамагаюць вызначаць некаторыя маркеры, напрыклад, такія выразы, як “былы царкоўны стараста”, што ўказваюць на праваслаўную традыцыю. У іншых выпадках можна толькі меркаваць пра праваслаўную ідэнтычнасць, улічваючы пры гэтым той факт, што праваслаўе з’яўлялася традыцыйным веравызнаннем для большасці сельскіх жыхароў, якія складалі ў канцы 1920-х гг. каля 80% насельніцтва БССР [2, с. 11].

Такім чынам, пры ўліку вышэйназваных асаблівасцей партыйна-дзяржаўнай тэрміналогіі, падчас аналізу архіўных дакументаў у праваслаўным асяроддзі БССР было выяўлена два тыпы нетрадыцыйнай рэлігійнасці (з шасці, якія наогул вызначае ў сваёй манаграфіі У.А. Марціновіч), прычым пераважна ў сельскай мясцовасці: 1) унутрыцаркоўнае сектанцтва – “разнастайныя формы нетрадыцыйных, паганскіх, акультна-містычных вераванняў і практык, якія існуюць у межах традыцыйных рэлігій свету” [1, с. 95]. У.А. Марціновіч вылучае наступныя прыкметы дадзенага тыпу нетрадыцыйнай рэлігійнасці: культ асобы, магічнае мысленне, апакаліптызм, палітэізм, экстрэмізм, самавольнае ўкараненне ў структуру царквы першапачаткова чужых для яе рэлігійных практык, сістэм веравучэння і метадаў працы [1, с. 95–96]; 2) так званае “культавае асяроддзе грамадства” – “уся сфера неінстытуалізаванай нетрадыцыйнай рэлігійнасці, што складаецца з сектанцкіх ідэй і рытуальных практык, якія падзяляюцца людзьмі па-за кантэкстам якой-небудзь рэлігійнай групы” [1, с. 94]. У кантэксце 1930-х гг. сюды варта адносіць разнастайныя чуткі “апакаліптычнага” характару, хрысціянскія культавыя практыкі (напрыклад, асвячэнне вады на Вадохрышча), здзяйсненне якіх магічна ўспрымалася насельніцтвам, стварэнне і распаўсюджванне так званых “лістоў шчасця”, або “святых лістоў”.

***Унутрыцаркоўнае сектанцтва.*** Па дакументах на тэрыторыі БССР у межах праваслаўя, пераважна ў другой палове 1930-х гг. фіксуюцца звесткі пра такія стыхійна арганізаваныя групы праваслаўных, як “маўчальнікі”, “чырвонадраконаўцы”, “хрыстаносы”.

Тэме “маўчальнікаў” прысвечаны некалькі прац беларускага гісторыка І. Раманавай [3; 4]. Падчас правядзення ўсесаюзнага перапісу 1937 г. па БССР “маўчальнікі” – 200–250 жыхароў Лепельскага і Тураўскага раёнаў – адмовіліся па рэлігійных прычынах даваць супрацоўнікам перапісу якія-небудзь звесткі пра сябе. І. Раманава адзначае, што ўлады адносілі “маўчальнікаў” да “апакаліптычнай і супрацьдзяржаўнай” секты “чырвонадраконаўцаў”, і прыходзіць да высновы, што “маўчальнікі” з'яўляліся праваслаўнымі сялянамі, якія “ў 1920-я гг. паспрабавалі знайсці зямлі і шчасця ў Сібіры, аднак пазней вярнуліся ў сваю вёску”, папярэдне ўспрыняўшы на новым месцы жыхарства “маўчальніцка-чырвонадраконаўскую ідэалогію” [3, с. 259–260]. Тым самым аўтар таксама звязвае “маўчальнікаў” з іншай радыкальнай праваслаўнай групай – “чырвонадраконаўцамі”, звестак пра якіх захавалася зусім няшмат, напрыклад, “у раёне маецца 2 чалавекі чырвонадраконаўцаў – Пракапчанка Аляксандр Захаравіч, які пражывае ў в. Сілічы, і Шуміла Яўсей, якія кажуць, што "савецкая ўлада і камуністычная партыя ёсць чырвоныя драконы"”[1].

Яшчэ адна стыхійна створаная праваслаўная група – “хрыстаносы”/“хрыстаносцы”, пра якіх партыйныя супрацоўнікі паведамляюць наступнае: “У Нясяцінскім сельсавеце на тэрыторыі калгасу ім. Ягорава секта хрыстаносцаў налічвае 30 чалавек (аднаасобнікі). Гэтыя цемрашалы носяць на грудзях крыж, і ў дамах іх на вушаках дзвярэй напісаны мелам крыжы, а ў куце мноства абразоў, упрыгожаных гэтымі крыжамі і свечкамі і стаіць бутэлька з вадой каля абразоў, на сцяне – контррэвалюцыйная эмблема Х+У, тлумачыцца на розныя лады (Хрыстос уваскрос – хочам вайны)… Яны распускаюць контррэвалюцыйныя чуткі: “Хутка не будзе калгасаў, а зямлю аддадуць нам”, знішчаюць пагалоўе жывёлы, кажучы, што есці свіное сала грэх… Падчас перапісу насельніцтва адказвалі на пытанні перапісчыкаў, што мы… верым у бога крэста і яго святую троіцу непадзельную”[2]. Дакладна невядома, сфарміраваліся “хрыстаносы” ва ўмовах адарванасці ад традыцыйных царкоўных структур ці ўзніклі як форма супрацьстаяння афіцыйнай царкве, але наяўнасць нетыповых для традыцыйнага праваслаўя элементаў, у прыватнасці, выкарыстанне белых крыжоў, “апакаліптызм” у настроях групы, таксама адмаўленне ад ужывання свініны (верагодна, як ад мяса “нячыстай” жывёлы), дазваляе, хаця б па гэтых фармальных прыкметах, разглядаць дадзеную групу вернікаў як прыклад унутрыцаркоўнага сектанцтва.

***Культавае асяроддзе грамадства.*** Найбольш распаўсюджанымі праявамі культавага асяроддзя грамадства ў 1930-я гг. з’яўляліся рознага роду рэлігійныя чуткі як рэакцыя на тыя ці іншыя мерапрыемствы, што праводзіліся “бязбожнай” савецкай уладай, з прычыны чаго негатыўнае стаўленне вернікаў-сялян распаўсюджвалася і на іх. Як сацыяльная з’ява, чуткі выконвалі пэўны шэраг функцый у грамадстве: псіхалагічная абарона ў сітуацыі няпэўнасці і магчымай пагрозы з боку новага сацыяльнага парадку, асэнсаванне сітуацыі і аднаўленне суб’ектыўнага кантролю, уплыў на настроі сялянскай супольнасці, спроба сацыяльнага аб’яднання сялян перад тварам магчымай небяспекі [5, с. 18–20]. Пры гэтым праз чуткі выключна свецкія падзеі асэнсоўваліся менавіта ў рэлігійным ключы, набывалі ў вачах іх распаўсюджвальнікаў адназначна рэлігійны характар. Напрыклад, уступленне ў калгасы падавалася як відавочна “антыхрысціянскае” мерапрыемства: “У в. Піцькоўка, Уваравіцкага раёна серадняком Майсеевым вядзецца агітацыя сярод калгаснікаў за выхад з калгаса, заяўляючы, што ў некаторых калгасах ужо прыступілі да кляймення калгаснікаў "чортавым кляймом", паказваючы пры гэтым,

[1] Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 251. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 5.

[2] НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 11867. Арк. 21–22.

што ў адным калгасе каля станцыі Чачора запрасілі ўсіх калгаснікаў з'явіцца да фельчара, нібы для прышчэпкі воспы, а калі калгаснікі сабраліся, іх пачалі кляйміць "чортавым кляймом"”[3].

Падобныя неверагодныя чуткі спараджалі ў сялянскім асяроддзі новыя, значна менш бяскрыўдныя, асабліва з пункту гледжання афіцыйных уладаў, рэакцыі, пачынаючы з байкаціравання калгасаў, узнікнення панічных настрояў да адмовы ад удзелу ў перапісе, дзяржаўнай грашовай дапамогі і пашпартоў, пацвярджэннем чаго служыць такі выпадак: “За апошні час адзначана распаўсюджванне ў Ручаеўскім сельсавеце, Лоеўскага раёна, асабліва ў в. Грохава, такой чуткі: “13 сакавіка падчас буры на небе бачылі ікону, вакол якой гарэлі свечкі, яны праляцелі каля Грохава, трымаючы накіраванне ў бок Хойнік, пасля буры ў суботу 15 сакавіка будзе 12 падземных удараў і ў Грохаве будзе забіта 12 калгаснікаў”. Гэты слых у Грохаве выклікаў панічны настрой. У многіх дамах круглыя суткі гарэлі лампадкі і маліліся богу”[4].

Самы вядомы выпадак масавага распаўсюджвання чутак пераважна рэлігійнага характару – гэта гісторыя з усесаюзным перапісам насельніцтва 1937 г. Аўтары спецзводак і спецпаведамленняў “Аб адмоўных настроях насельніцтва ў сувязі з перапісам” неаднаразова ўказвалі, што найпершае пытанне, якое хвалявала насельніцтва, было “галоўным чынам, аб пункце – вернік або нявернік”[5]. Пры аналізе дакументаў выявілася, што настроі шэрагу вернікаў мелі “апакаліптычны” характар: савецкая ўлада ўспрымалася імі як “улада антыхрыстава”, а перапіс насельніцтва ўяўляўся працэсам накладання “пячаткі антыхрыста”. Людзі разважалі наступным чынам: “Перапіс – гэта д'ябальская справа, хто будзе падвяргацца перапісу, таго будуць кляйміць, а таму, калі пачнецца перапіс, трэба ўсім на гэты час схавацца, дзе хто можа”, “Пералік насельніцтва – гэта перад канцом свету, бянтэжаць вернікаў”[6]. Становішча ўскладнялася тым, што перапіс быў прызначаны напярэдадні праваслаўнага Раства Хрыстова – 6 студзеня, і падобнае адкрытае пытанне аб веры з боку “бязбожнай” улады ўяўлялася многім вернікам канчатковым выбарам паміж Богам і д'яблам. Нават сам удзел у перапісе ўспрымаўся як адступленне ад веры. Вынікамі гэтай светапогляднай пазіцыі сталі дэманстратыўныя адмовы з боку вернікаў даваць аб сабе любыя звесткі падчас перапісу амаль ў кожным раёне БССР.

Яшчэ адна спецыфічная форма праявы ўплыву культавага асяроддзя грамадства – гэта так званыя “лісты шчасця” (“святыя лісты”, “божыя лісты”). Дадзены феномен таксама апісаны У.А. Марціновічам, які пад “лістамі шчасця” мае на ўвазе “… тэксты, што перасылаюцца па пошце і заклікаюць пад рознымі падставамі іх размножыць і распаўсюдзіць далей” [6, с. 72]. У.А. Марціновіч, адносячы “лісты шчасця” да сферы нетрадыцыйнай рэлігійнасці, магічнага ўспрымання рэчаіснасці, звяртае ўвагу як на іх рэлігійны або акультны змест, так і на прычыны, па якіх людзі іх перапісваюць, як правіла, рознага роду забабоны. У БССР дадзеныя лісты часцей за ўсё перапісваліся школьнікамі – дзецьмі вернікаў – і распаўсюджваліся ў школах, акрамя таго, маглі перадавацца праз дарослых з вёскі ў вёску. Змест адной з такіх “агітацыйных запісак на рэлігійную тэму” (а менавіта так успрымаліся “святыя лісты” савецкімі ўладамі) выглядаў наступным чынам: “Народ у Ерусаліме падчас набажэнства, пачулі голас Ісуса Хрыста, маліцеся Богу хоць ойча-наш, хто атрымае гэтую запіску, той павінен напісаць такіх 9 і раздаць у 2 дні і праз 9 дзён атрымае радасць, а калі не перадасць, то атрымае гора, як гэта было ў г. Харкаве, адзін чалавек атрымаў гэтую запіску і не раздаў, чакаў радасці і праз 9 дзён атрымаў смутак, меў аднаго сына і той быў забіты праз 9 дзён”[7]. Вядома, не зусім зразумела, ці менавіта праваслаўныя распаўсюджвалі чуткі і “лісты шчасця”, аднак уяўляецца верагодным, што праваслаўныя вернікі маглі ў гэтым удзельнічаць, ўлічваючы, напрыклад, згадванне ў некаторых “лістах шчасця” “божай маці”[8], ушанаванне якой не ўласціва баптыстам, евангелістам і г.д.

У рамках дадзенага артыкула варта згадаць пра яшчэ адзін тып нетрадыцыйнай рэлігійнасці, які ўскосна звязаны з праваслаўным асяроддзем, а менавіта распаўсюджванне на тэрыторыі БССР у 1920 – 1930-я гг. уласна сект – “арганізацый, якія маюць моцную арганізацыйную структуру, інстытут пастаяннага членства, усебакова развітае веравучэнне, якое ахоплівае ўсе сферы быцця чалавека і свету” [1, с. 91]. У выніку даследавання выявілася, што сектанцкія абшчыны (у архіўных дакументах згадваюцца баптысты, евангелісты, штундысты) былі распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі БССР і пры гэтым дэцэнтралізаваны, дзейнічалі невялікімі групамі, сем'ямі ў мястэчках і вёсках. Існавала практыка прыездаў на сяло прапаведнікаў з буйных гарадоў, якія місіянерствавалі ў тым ліку сярод праваслаўнага насельніцтва. Аб пэўнай зацікаўленасці з боку праваслаўных да прапаведніцкай дзейнасці сектантаў, аж да пераходу першых у секты, сведчаць наступныя дакументы: 1) вызначэнне Пленума Аршанскага абнаўленчага епархіяльнага ўпраўлення за 1930 г.: “Праваслаўныя людзі не знаходзяць часта задавальнення сваіх рэлігійных патрэб у сваіх пастыраў, падаюць духам пры выглядзе расколу ўнутры нашай царквы, часам бягуць да сектантаў, якія нярэдка падкупляюць сваёй узаемадапамогай, устрыманнем ад віна і тытуню, брыдкаслоўя і г.д.”[9]; 2) у дакладной запісцы аб стане антырэлігійнай працы ў Касцюковіцкім раёне за 1935 г. паведамляецца, што былы стараста Сяліцкай царквы Я. Старычкаў “у сувязі з тым, што па раёне зачыненыя ўсе цэрквы, перайшоў у секту евангелістаў”[10]; 3) ліст абнаўленчага протапрэсвітэра Пятра Шымковіча ад 4 лютага 1935 г., у якім ён апісвае

[3] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (далей – ДАГАГВ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 714. Арк. 381–382.
[4] ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 714. Арк. 29.
[5] НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 12036. Арк. 7.
[6] НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 12035. Арк. 9.
[7] ДАГАГВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 714. Арк. 103.
[8] НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 57. Спр. 12082. Арк. 108.
[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 2786. Воп. 1. Спр. 452. Арк. 117адв.
[10] НАРБ. – Ф. 251. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 3–4.

місіянерскія прыёмы сектантаў і канстатуе неаслабную цікавасць насельніцтва да рэлігіі: "…Пытанні рэлігійныя хвалююць, рэдка дзе абыходзіцца сход, вядома, прыватнага парадку, дзе б не ўзнялі пытання "пра папа", "пра Бога" і г. д., і для сектантаў глеба зручная, а для нас не. Мы не можам наведваць такіх сходаў па многіх прычынах і асабліва з перасцярогі, каб не стаць ахвярамі абвінавачанняў у агітацыі і г.д., а сектант – свой брат. Яму і доступ зручны і падазрэння не выкліча, пакуль не выявіць сябе відавочна як сектанцкі прапаведнік"[11].

Разважаючы пра прычыны пераходу ў секты праваслаўных, трэба адзначыць дэцэнтралізаванасць груп сектантаў: іх дзейнасць было цяжэй выяўляць уладам, што нібыта гарантавала большую бяспеку для вернікаў ва ўмовах антырэлігійнага праследвання з боку савецкай дзяржавы. Акрамя таго, ва ўмовах нарастаючага духоўнага вакууму, пры паслядоўнай ліквідацыі храмаў і спыненні традыцыйнага царкоўнага жыцця ва ўсіх яго праявах, місіянерская праца пратэстанцкіх прапаведнікаў магла таксама прыцягваць праваслаўных вернікаў, якімі неапратэстанцкія абшчыны ў першую чаргу і папаўняліся. Што тычыцца расколаў і ўнутрыцаркоўных канфліктаў, то іх уплыў на адносіны вернікаў да царквы менш верагодны: у 1930-я гг. у параўнанні з папярэднім дзесяцігоддзем з прычыны масавага закрыцця цэркваў і скарачэння колькасці духавенства адзіным вартым крытэрыем паступова станавілася простая наяўнасць у дазенай мясцовасці святара, да якога можна было б звярнуцца за адпраўленнем абрадаў і таінстваў. Як перадаваў змест прыхадскіх просьбаў аб назначэнні святара адзін з абнаўленчых архіерэяў у 1931 г.: "Толькі хутчэй дашліце, хоць чырвонага, хоць зялёнага, але толькі папа"[12].

**Заключэнне.** Такім чынам, у 1930-я гг. сярод праваслаўнага насельніцтва БССР фарміруюцца і распаўсюджваюцца наступныя тыпы нетрадыцыйнай рэлігійнасці, паводле класіфікацыі У.А. Марціновіча па структуры: 1) культавае асяроддзе грамадства – пераважна ў выглядзе разнастайных чутак рэлігійна-апакаліптычнага характару; 2) элементы ўнутрыцаркоўнага сектанцтва – зафіксаванае ў архіўных дакументах з'яўленне ізаляваных праваслаўных груп "чырвонадраконаўцаў", "маўчальнікаў", "хрыстаносаў", для якіх было характэрна радыкальна варожае стаўленне да савецкай улады як да ўлады "антыхрыставай", поўнае ці частковае дыстанцыраванне ад яе, апакаліптычныя настроі, ужыванне новых культавых практык і элементаў веравучэння.

Пры аналізе крыніц неабходна было ўлічваць тэрміналагічныя асаблівасці савецкіх партыйна-дзяржаўных дакументаў, няпэўнасць выкарыстання тэрміна "царкоўінк", пад якім аўтары дакументаў маглі разумець не толькі праваслаўных, але і старавераў, а ў некотрых выпадках нават сектантаў, што ўскладняла вызначэнне канфесійнай прыналежнасці вернікаў, згаданых у прааналізаваных дакументах.

Акрамя таго, трэба адзначыць сувязь праваслаўнага насельніцтва з яшчэ адным тыпам нетрадыцыйнай рэлігійнасці, паводле У.А. Марціновіча, – уласна сектамі, пераход часткі праваслаўных вернікаў у якія назіраецца на працягу 1930-х гг. У пераважнай большасці гэты працэс адбываецца пад уплывам антырэлігійнай палітыкі савецкай дзяржавы, калі ва ўмовах закрыцця храмаў, знікнення праваслаўных святароў вернікі пачынаюць шукаць задавальнення "рэлігійных патрэб" сярод больш дэцэнтралізаваных і менш кантраліруемых афіцыйнымі ўладамі сектанцкіх груповак.

ЛІТАРАТУРА


1. Мартинович В.А. Нетрадиционная религиозность: возникновение и миграция. – Минск: МинДА, 2015. – 559 с.
2. Праферансаў. Стэнаграма даклада кіраўніка ЦСУ БССР тав. Праферансава на пасяджэнні СНК БССР 21 лістап. 1928 г. па пытанні аб выніках дэмаграфічнага перапісу 1926 г. / Праферансаў. – Мінск: Выд-ва Кіраўн. Спраў СНК і Экан. Нарады БССР, 1928. – 18 с.
3. Раманава І.М. Кляйменне Чырвонага дракона. Усесаюзны перапіс насельніцтва 1937 года і яго трактоўка ў сялянскім дыскурсе // ARCHE. – 2012. – № 3. – С. 246–261.
4. Романова И. Клеймение Красного Дракона. 1937–1939 гг. в БССР. – М.: РоссПЭН, 2021. – 305 с.
5. Горбатов Д.С. Функции слухов в социальной среде // Ученые записки СПбГИПСР. – 2014. – Вып. 1. Т. 21. – С. 18–20.
6. Мартинович В.А. Письма счастья как элемент оккультной среды общества // Минские епархиальные ведомости. – 2007. – № 1. – С. 72–76.


*Паступіў 12.10.2023*

**НЕТРАДИЦИОННАЯ РЕЛИГИОЗНОСТЬ СРЕДИ ПРАВОСЛАВНОГО НАСЕЛЕНИЯ БССР В 1930-Е ГГ. (ПО МАТЕРИАЛАМ ГОСУДАРСТВЕННЫХ АРХИВОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ)**

***канд. ист. наук, доц. А.С. КАЛИНИНА***
***(Институт теологии имени святых Мефодия и Кирилла***
***Белорусского государственного университета, Минск)***

*Статья посвящена попыткам выявления и анализа элементов нетрадиционной религиозности в православной среде БССР, которая формировалась в 1930-е гг. под влиянием секулярной политики советского государства,*

[11] НГАБ. – Ф. 2786. Воп. 1. Спр. 562. Арк. 55.
[12] НГАБ. – Ф. 2786. Воп. 1. Спр. 487. Арк. 100.

*имеющей своей основной целью постепенное вытеснение религии и церкви из всех сфер жизни общества. Исследование проводится на основе классификации типов нетрадиционной религиозности по структуре, разработанной специалистом в области новых религиозных течений В.А. Мартиновичем, на основе документов государственных республиканских и региональных архивов Беларуси. Указывая на некоторые терминологические затруднения, связанные с неочерченностью употребления термина «церковник» в государственно-партийной документации, автор приходит к выводу о распространении среди православных верующих БССР таких типов нетрадиционной религиозности, как культовая среда общества и элементы внутрицерковного сектантства, а также определение влияния антирелигиозной государственной политики на переход православных в собственно секты.*

***Ключевые слова:*** *православие, Белорусская Православная Церковь, нетрадиционная религиозность, культовая среда общества, внутрицерковное сектанство, секты, антирелигиозная политика советского государства.*

## UNCONVENTIONAL RELIGIOSITY AMONG THE ORTHODOX POPULATION OF THE BSSR IN THE 1930s (BASED ON THE MATERIALS FROM THE STATE ARCHIVES OF THE REPUBLIC OF BELARUS)

***H. KALININA***
***(Saints Methodius and Cyrill Theology Institute of Belarusian State University, Minsk)***

*The article attempts to identify and analyze the elements of unconventional religiosity among the Orthodox population of the BSSR formed in the 1930s under the influence of secular policy of the Soviet state which had as its main goal the successive displacement of religion and church from all spheres of society. The research is organised according to the classification of types of unconventional religiosity by structure developed by the specialist in new religious movements V. Martinovich and is based on the documents of the state republic and region archives of Belarus. Pointing out some terminological difficulties related to the vagueness of the use of the term "churchman" in the Soviet documentation, the author comes to the conclusion about spreading of such types of unconventional religiosity among the Orthodox believers of the BSSR as cult environment of the society and elements of intra-church sectarianism and also determines the influence of anti-religious state policy on the transition of Orthodox people into the sects proper.*

***Keywords:*** *Orthodoxy, Belarusian Orthodox church, unconventional religiosity, cult environment of the society, intra-church sectarianism, sects, anti-religious policy of the Soviet state.*